## «НОВАЯ П'ЕСА» Ў СУЧАСНАЙ ДРАМАТУРГІІ: ДА ПЫТАННЯ СТЫЛЕЎТВАРЭННЯ

(на матэрыяле сучаснай украінскай драмы)

*Бабіч Т.М.,*
*кандидат мастацтвазнаўства, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры імастацтваў*

Працэсы, якія адбываюцца сёння ў драматургіі, на жаль, яшчэ не даследаваны, дакладней, яны не вызначаны з пункту гледжання тэатразнаўчых і літаратуразнаўчых катэгорый. Яны супярэчлівы і імклівы. Новы драматургічны матэрыял зменлівы і спрэчны, не дазваляе яшчэ рабіць высновы, абгрунтаванні і абагульненні і, наадварот, хутчэй спрыяе нараджэнню гіпотэз, прагнозаў, запрашае да творчых дыскусій. Ніводны з сучасных тэатральных фестываляў ці драматургічных конкурсаў не абыходзіцца без спрэчак аб навейшай драматургіі. Абмеркаванні новай п'есы (яе стылістыцы і змястоўнасці) прыс- вечаны «круглыя сталы» тэатральных крытыкаў, навуковыя і публіцыстычныя артыкулы. Сучасныя новыя драматургі, у асноўным маладыя, са сваім светабачаннем, прапаноўваюць новыя тэмы і сітуацыі, герояў, формы і мову, і як вынік,— узнікаюць новыя патрабаванні да тэатра.

Сучасны літаратурны тэкст — не толькі адлюстраванне рэалій сучаснасці, не толькі «злоба дня», гэта новыя погляд, думка, боль. І сучасная літаратура правакацыйная, зменлівая, інакшая... Мімаволі яна стала незаангажыраванаю, вольнаю ад ідэалогіі і фінансавай залежнасці. Драматургія за доўгі час страціла выбітных майстроў, аўтарытэтаў, перарвалася «сувязь часоў». І як вынік—замест дагматаў адной мадэлі нарадзілася цэлая плынь розных мадэлей, што спрыя- ла з'яўленню літаратурнага феномена «новая п'еса». Новыя творцы суадносяць сябе не з былымі класікамі літаратуры, а з майстрамі сусветнай літаратуры. Ад- сюль і шматвектарнасць пошукаў — ад сучаснай інтэрпрэтацыі даўніх міфаў і містычнага падарожжа ў паралельны свет да стварэння філасофскіх прытч, сучасных казак, актуальных ілюзій, постабсурдысцкіх драм і ігры фантазіі ў стылі «фэнтэзі» і «хімерных феерый». Сучасная драматургія не статычная, не мае паўз — яна развіваецца па асабістых законах. І за канфігурацыяй знешняй герметычнасці праглядаецца поступ так званай «новай хвалі».

У нашым артыкуле панарамна разглядаецца творчасць сучасных украінскіх драматургаў, заснавальнікаў новай плыні ў нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

украінскай літаратуры. Багдан Жолдак, Алег Ганчароў, Алег Мікалайчук-Нізавец, Аляксандра Пагрэбінская, Неда Няждана, Ларыса Парыс, Марыя Ладо, Уладзімір Сярдзюк, Яраслаў Верашчак і іншыя прэзентуюць спектр розных творчых стыляў, мастацкіх прыёмаў, адлюстроўваюць шматвектарнасць пошуку сучаснай драмы.

За часы незалежнай Украіны была надрукавана невялікая колькасць зборнікаў п'ес у параўнанні са шматлікімі выданнямі прозы або паэзіі. І растлумачыць гэтую з'яву элітарнасцю ўкраінскай драмы проста немагчыма. Настае час адраджэння традыцыі пастаяннага існавання драматурга ў літаратурнай прасторы, пошук стабільнага месца ў сусвеце. Тэатр, як лічаць яго стваральнікі, калі карыстаецца толькі мінулымі ці запазычанымі мадэлямі, а не ставарае ўласнага, не мае будучыні. Сучасныя ўкраінскія драматургі не баяцца спрабаваць і рызыкаваць, не баяцца нязнанага, не хаваюцца за ценямі класікаў. Іх творы адначасова створаны і для шырокага кола чытачоў, і для эксперыментальнай сцэны. І як доказ — яны не аднойчы ставіліся на сцэнічных «майданчыках» Украіны і за мяжой. Шмат сучасных драматургаў выступалі рэжысёрамі сваіх твораў. На жаль, беларускаму чатачу і масавай тэатральнай аўдыторыі імёны большасці з іх застаюцца невядомымі. У такой сітуацыі актуалізуецца пытанне доступу айчыннаму прыхільніку да твора-арыгінала і прафесійнага яго друкава- нага перакладу на беларускую мову. Аднак як альтэрнатыўны аргумент адзначым, што на некаторых беларускіх сцэнічйых пляцоўках з поспехам ідуць п'есы М. Ладо, А. Ганчарова, *Я.* Парыс, Б. Жолдака і іншых украінцаў. Трэба адзначыць, што сучасны беларускі тэатр, на жаль, і баіцца наплыву невядомых аўтараў.

Добры аргумент можна знайсці на карысць існавання сучаснай літаратуры ўсходніх суседзяў. Ва Украіне з 2004 г. распачаты цікавы творчы праект у супрацоўніцтве міжнароднага фонду «Адраджэнне», Канфедэрацыі драматургаў Украіны, Цэнтра тэатральнага мастацтва імя Лэся Курбаса, тэатра імя І. Франка і плеяды сучасных дзеячаў культуры «Наша драма». У межах яго адбываюцца аўтарскія чытапні новых п'ес, пастаноўкі п'есы-пераможцы. Сумеснымі намаганнямі фундатараў была надрукавана серыя твораў сучаснай украінскай драматургіі — анталогія «Страйк ілюзій», зборнікі «Наша драма», «Новая п'еса», «Сучасная ўкраінская драматургія» і іпш. Выданні прэзентуюць спектр розных стыляў і адлюстроўваюць літаратурныя пошукі сучаснай украінскай драмы.

Ніякі аргумент наконт азначанага феномена-з'явы не можа быць упэўнепым без дакладных прыкладаў, імён. Прапануем кароткі экспрэс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агляд творчасці некаторых аўтараў сучаснай украінскай драматургіі, прадстаўнікоўт. зв. «новай хвалі».

Багдан Жолдак — адзін з самых рэспектабельных сучасных украінскіх драматургаў. Ён журналіст, перакладчык, празаік, кінасцэнарыст, прадстаўнік літаратурнай плыні «Новая хваля», аўтар п'ес («Закаханы чорт», «Гліна», «Га- лодная кроў», «Зачаравапы запарожац» і інш.), зборнікаў прозы («Спакусы», «Ялавічына-макабрэскі», «Як сабака пад танк», «Бог бывае»), сцэнарыяў да ігравых («Казакі ідуць», «Ведзьма», «Іван ды кабыла», Дарога на Сеч»), а таксама кароткаметражных, дакументальных, анімацыйных фільмаў. Б. Жолдак — вядомы ва Украіне тэатральны рэжысёр Яго пастаноўкі — гапак-опера «Ка- натопская ведзьма» (па матывах п'есы Г. Квіткі-Аснавяненкі), «Хто здрадзіць Бруту?» (па матывах «Вія» М. Гогаля) (пастаўлены на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя І. Франка ў г. Кіеве), «Казак Мамай і Скіфская баба» (Харкаў Кіеў) і інш.

Алег Ганчароў — драматург, паэт, кампазітар, празаік, аўтар гумарыстычных апавяданняў. Мае ў актыве больш за 20 рознажанравых п'ес, сярод якіх «Хронікі Чукоцкіх эміратаў», «Урокі дэтэрмінізму», «Акно з відам на смерць», «Выпадковыя дзеці ад Нобеля», міракль «Сем крокаў да Галгофы», «Сіндром маладой жонкі» і інш.

Яраслаў Верашчак — драматург, член Саюза пісьмсннікаў Украіны, старшыня фонду «Гільдыя драматургаў Украіны». З'яўляецца аўтарам болын за 30 п'ес, сярод якіх «Уніфарміст», «Сантана», «Імправізацыя», «Брат мой», «Банка згушчонага малака», «Каралеўскі асабняк», «Схованка», «Проба: С. Б (Сцяпан Бандэра»), сучаснай казкі «Слав. Ко-Ко...» і інш. Яго п'есы ставіліся на шматлікіх сцэнах украінскіх драматычных тэатраў.Я. Верашчак — патрыярх украінскай драматургіі, стваральнік чароўнага казачнага ўкраінскага свету, у якім пантэістычна суіснуюць жывёлы, кветкі, хімеры, казачныя істоты, але за гэтым усім улоўліваецца сэнс нашага жыцця.

Незвычайную ілюзію чалавечага жыцця прапануе ў сваіх творах Ларыса Парыс — ілюзію сусветнага парадку, заснаванага на рытме і гармоніі. Створаны мастацкі свет цалкам іманентны, нават цяжка знайсці сувязі, што звязваюць яго з сучаснай рэальнасцю. Гэта свет гукаў, сусветнай музыкі, які актуалізуецца такімі вербальнымі знакамі, як «струны», «арфы», «званочкі». Л. Парыс — вядомая жанчына-драматург, рэжысёр, актрыса (выпускніца Школы студыі МХАТ), аўтарка п'ес «Ганна і Крыстоферсон» (паводле твора «Ганна Крысці» Ю. О'Ніла), «Дэр Вальд» (паводле п'есы «Лес» А. Астроўскага), новай містэрыяльнай драмы «Я. Сірыўс. Кентаўр», рок-паэмы «Песні Пекла», кінасцэнарыяў «Бедныя», «Смерць Анарыта» і інш. Вядома як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатральны рэжысёр (пастаноўкі — «Крэслы», «Лысая спявачка» Э. Іанэска, «Шчаслівыя дні» С. Бэкета, мона-зінгшпіля «Арыя.ги» Т. Буеўскага), як творца (драматург, рэжысёр, актрыса) прымала ўдзел у арт-праектах і тэатралыіых пастаноўках: «Сон у летнюю ноч» (паводле У Шэкспіра), «Кацярына Кабанава, як яна ёсць» (паводле п'есы «Навальніца» А. Астроўскага), «Праметэй-урок» (паводле Эсхіла), «Шкляны Ансельм» (мюзікл паводле Э.Т.А. Гофмана) і інш.

Уладзімір Сярдзюк — журналіст, пісьменнік (3 раманы, болын за 100 навэл і апавяданняў), драматург (каля 20 п'ес), тэатральны і кінакрытык. Сярод вядомых яго п'ес трэба адзначыць «Пенсійныя справы», «М», «Мянс паказваюць па ТБ», «Сястра міласэрнасці», «Пласцілінавы метал» і інш.

Кацярына Дзямчук — драматург, празаік, перакладчыца, аўтарка п'ес «Зачараванае кола, ці Калыска для Лэсі», «Сцэны з жыцця насоў», фарса для двух блазнаў, гадзінніка і марыянетак «На виступцях» (з укр.). У спектры ўласных аўтарскіх адлюстраванняў — ілюзіі пра свет, жыццё, ірэальнае бачанне асяроддзя (як унутранага, так і знепіняга), мадэляванне рэчаіснасці,ягоідэалізацыяіадначасоваспантаннаяінтэрпрэтацыя,імкненне да інтэлектуальнасці, неардынарнасці, — усяго таго, што ўласціва аўтарскаму светапогляду. Рэаліі сучаснага жыцця калейдаскапічна змяняюцца, пашыра- ецца поле інфармацыйнага тэксту. Ва ўмовах постінфармацыйнага грамад- ства нараджаецца літаратурны эксперыменталізм. Сучасная драматургія шматвобразна, патрабуе далейшых назіранняў і даследавання, яе мастацкі ўзровень яшчэ недастаткова вызначыўся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ